# АЙЧЫННАЯ ГІСТОРЫЯ

*С. М. ТОКЦЬ*

## ЗАМОЖНАЕ СЯЛЯНСТВА ПАСЛЯРЭФОРМЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў СВЯТЛЕ МІКРАГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ
### (на матэрыялах Скідзельскай воласці Гродзенскага павета)

Праблема сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства з'яўляецца адной з ключавых праблем у гістарычным вывучэнні паслярэформеннай беларускай вёскі. Выкарыстанне мікрагістарычнага падыходу дазваляе вывучыць новыя аспекты дадзенай праблематыкі, разгледзець індывідуальныя лёсы і жыццёвыя стратэгіі прадстаўнікоў заможнага сялянства, якому надавалася недастаткова ўвагі ў беларускай савецкай гістарыяграфіі. Вынікі мікрагістарычнага даследавання Скідзельскай воласці Гродзенскага павета сведчаць, што толькі некалькі сялянскіх сем'яў, якія яшчэ ў прыгонніцкі час займалі даволі высокія пазіцыі ў мясцовым грамадстве, змаглі дасягнуць значнага матэрыяльнага поспеху і падняцца ўверх па сацыяльнай лесвіцы.

The problem of social differentiation of the peasantry is among key problems in historical studying of the poreformenny Belarusian village. Use of a microhistorical approach allows to study new aspects of this problem, to consider individual destinies and vital strategy of representatives of the prosperous peasantry. The matter was given not enough attention in the Belarusian Soviet historiography. Results of microhistorical research of the Skidel volost of the Grodno district testify that only few peasants families, could achieve considerable material success and rise up on a social ladder.

*Ключавыя словы*: сяляне, вясковая эліта, «кулакі», сацыяльна-маёмасная дыферэнцыяцыя, мікрагісторыя.

*Keywords*: The peasants, rural elite, «kulaks», social property differentiation, microhistory.

**Токць Сяргей Міхайлавіч** — дактарант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат гістарычных навук.

У вывучэнні гісторыі беларускай вёскі эпохі капіталізму (другая палова XIX — пачатак XX ст.) асаблівая ўвага айчыннымі даследчыкамі надавалася праблеме дыферэнцыяцыі сялянства, вылучэння з яго асяроддзя заможнай меншасці і збяднення большасці [1—6; 26—29]. Адзін з найбольш аўтарытэтных беларускіх савецкіх гісторыкаў К. І. Шабуня пісаў, што «...общественно-экономическое развитие деревни шло по пути образования сельской буржуазии и вытеснения массы беднейших хозяев в ряды пролетариата» і адбываўся «процесс разложения крестьянства не две противоположные классовые группы» [29, с. 92]. Адразу трэба падкрэсліць, што абавязковая ў савецкія часы марксісцкая метадалогія даследавання навязвала гісторыкам свае патрабаванні адносна ацэнкі гэтага працэсу і яго суб'ектаў. «Багатырам», як звычайна называлі ў беларускай вёсцы заможных сялян, прысвячалася ў гістарычных працах значна менш увагі ў параўнанні з бяднейшай часткай сялянства. У выніку атрымалася, што беларускі вясковы буржуа заставаўся своеасаблівым таямнічым незнаёмцам, прычым з дрэннай рэпутацыяй эксплуататара сваіх братоў-аднавяскоўцаў.

У апошнія гады ў айчыннай гістарыяграфіі назіраецца паступовы адыход ад марксісцкіх схем і пастулатаў. Тэрмін «кулакі», які мае выразную негатыўную афарбоўку, выкарыстоўваецца ўсё радзей і паволі знікае з навуковага дыскурсу. Даследчыкі спрабуюць знайсці больш нейтральныя паняцці. Напрыклад, Вячаслаў Насевіч у сваім мікрагістарычным даследаванні беларускай вёскі ўжывае тэрмін «сялянская эліта» і адступае ад традыцыі негатыўнай ацэнкі заможных гаспадароў [26, с. 253]. Ганна Маскевіч выкарыстоўвае тэрмін «заможнае сялянства», якому прысвячае асобны раздзел сваёй кандыдацкай дысертацыі [6, с. 12].

Адным з ключавых пытанняў у даследаваннях заможнага сялянства з'яўляецца наступнае: каго і паводле якіх крытэрыяў можна аднесці да гэтай групы? К. І. Шабуня ў сваёй манаграфіі «Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг.» прысвяціў сялянскай буржуазіі асобны параграф і спасылаецца на Уладзіміра Леніна, які адносіў да сельскай буржуазіі «самостоятельных хозяев, ведущих торгово-промышленное земледелие» [29, с. 111]. Паводле марксісцкай метадалогіі найбольш адпавядае на ролю буржуа той селянін, які выкарыстоўвае наёмных работнікаў, ці, калі ўжываць мову класікаў, купляе працу бедных сялян. Але К. І. Шабуня слушна сцвярджае, што «употребление наемного труда не является обязательным признаком мелкой сельской буржазии», паколькі такую працу выкарыстоўвалі і небагатыя сяляне, у сем'ях якіх проста на хапала рабочых рук [29, с. 93]. В. П. Па-

нюціч таксама прыйшоў да высновы, што наёмных працаўнікоў выкарыстоўвалі многія сялянскія гаспадаркі, але для адных гэта было жыццёвай неабходнасцю, а для другіх сродкам матэрыяльнага ўзбагачэння [28, с. 293]. Толькі вельмі складана правесці гэтую мяжу паміж матэрыяльным ўзбагачэннем і жыццёвай неабходнасцю. Апроч таго, даныя адносна выкарыстання наёмных работнікаў рэдка сустракаюцца ў крыніцах.

Наступным важным крытэрыем з'яўляюцца памеры зямельнай уласнасці. У беларускай савецкай гістарыяграфіі склалася традыцыя далучаць да кулакоў тых, каму належала больш за 20 дзесяцін зямлі. Лічылася, што такі надзел ужо перавышае норму, патрэбную для «нармальнага» жыцця сялянскай сям'і. Пра недахопы падобнага падыходу мы пагаворым ніжэй. Яшчэ адным важным крытэрыем з'яўлялася забяспечанасць сялянскай гаспадаркі рабочай жывёлай. К. І. Шабуня да кулакоў адносіў уладальнікаў трох і болей коней, як галоўнай цяглавай сілы ў сялянскай гаспадарцы. Паводле падлікаў гэтага аўтара, заснаваных на выкарыстанні вышэйназваных крытэрыяў, у 1905 г. на беларускіх землях «кулакі» складалі 11 % ад усяго сялянскага насельніцтва [29, с. 92].

Гэтых жа крытэрыяў прытрымліваецца і В. П. Панюціч, паводле падлікаў якога на рубяжы XIX—XX стст. кулакі складалі 8 % сярод сялянскага насельніцтва Беларусі. В. П. Панюціч таксама сцвярджае, што заможныя сяляне Беларусі ў парэформенны перыяд пачалі паскорана набываць зямлю, а вясковая бедната, наадварот, яе губляла. Галоўная выснова аўтара гучыць так: «Крестьянское сельскохозяйственное производство всё более концентрировалось в руках незначительного меньшинства, эксплуатировавшего деревенскую бедноту» [28, с. 346].

Паводле даных Г. І. Маскевіч, у 1877 г. заможныя гаспадаркі складалі 10,4 % ад усіх сялянскіх двароў, а ў 1905 г. — 7,8 %. Даследчыца таксама адносіць да групы заможных сялян уладальнікаў надзелаў памерам 20 дзесяцін зямлі і болей. Прычым, на думку Г. І. Маскевіч, «фарміраванне групы заможных гаспадарак адбывалася пераважна за кошт былых памешчыцкіх сялян» [6, с. 12].

На нашу думку, адным з галоўных недахопаў існуючай на сённяшні дзень навуковай літаратуры па дадзенай праблеме з'яўляецца абстрактнасць і ананімнасць вобраза сельскага буржуа. Часта за лічбавымі паказчыкамі нябачна жывых людзей, многія з якіх, несумненна, з'яўляліся незвычайнымі для свайго часу асобамі. Кім жа быў гэты таямнічы «кулак» савецкіх гісторыкаў, «багатыр» у вачах сваіх аднавяскоўцаў і проста заможны гаспадар, як называюць яго сучасныя даследчыкі? Якімі шляхамі дасягаў ён свайго матэрыяльнага поспеху і як выбудоўваў стра-

тэгію адносін з іншымі персанажамі тагачаснага грамадства? Знайсці больш поўны і змястоўны адказ на гэтыя пытанні можа дапамагчы выкарыстанне мікрагістарычнага падыходу. Па такім шляху пайшоў В. Насевіч у сваім манаграфічным даследаванні мікрарэгіёна Кораньшчына, адзін з раздзелаў якога прысвечаны заможнаму сялянству. Намі ж у якасці аб'екта даследавання была абрана Скідзельская воласць Гродзенскага павета.

Змена маштабу даследавання і пераход з макра- на мікраўзровень дазваляе больш ясна і выразна ўбачыць недахопы тых колькасных крытэрыяў, на якіх выбудоўваюцца лічбавыя даныя пра ўдзельную вагу кулакоў на беларускіх землях. Возьмем галоўны крытэрый стратыфікацыі сялянскіх гаспадарак паводле велічыні зямельнага надзелу. Гэты крытэрый не ўлічваў якасці зямлі. Напрыклад, у маёнтку Скідзель князёў Чацвярцінскіх у выніку рэалізацыі палажэнняў рэформы 1861 г. увогуле не было сялянскіх гаспадарак з надзеламі больш за 20 дзесяцін зямлі, а надзелы велічынёй ад 15 да 20 дзесяцін бачым толькі ў адной вёсцы Сухаўляны (і тое за кошт дадзенага сялянам лесу). Гэтыя гаспадаркі складалі толькі 7,35 % ад агульнай колькасці двароў [18].

Але ўжо ў суседняй Берштаўскай воласці поўны сялянскі надзел складаў больш за 40 дзесяцін [21]. Значыцца, усе 379 двароў гэтай воласці можна аднесці да ліку заможных, а гэта складала 3,73 % ад колькасці ўсіх сялянскіх зямельных надзелаў у Гродзенскім павеце. А калі дадаць яшчэ 313 такіх жа па велічыні двароў Сабалянскай воласці, дык атрымаем у суме лічбу 629 заможных гаспадарак, ці 6,2 % сялянскіх двароў Гродзенскага павета. Але з прычыны дрэннай якасці зямлі на прасторах Гарадзенскай пушчы сяляне Берштаўскай воласці ў большасці сваёй жылі бядней у параўнанні з жыхарамі Скідзельскай воласці, пра што сведчаць і даныя гаспадарчых інвентароў. Такім чынам, у адносінах да Гродзенскага павета крытэрый велічыні зямельнага надзелу істотна скажае рэальную карціну маёмаснай дыферэнцыяцыі сялянства.

Крытэрый забяспечанасці сялянскіх гаспадарак цяглавай сілай звычайна выкарыстоўваецца даследчыкамі на падставе аналізу так званых конскіх перапісаў. Але выкарыстаць яго на мікраўзроўні аказалася справай даволі складанай. Даныя адносна колькасці коней у гаспадарках сялян Скідзельскай воласці мы знайшлі толькі адносна вёскі Сухаўляны за 1910 г. [23, арк. 67 адв. — 72]. Ніхто з 42 гаспадароў гэтай вёскі, адной з самых заможных у воласці, не меў трох каней, у 14 (33,3 %) было па два, у 28 — па адным (66,7 %), бясконныя гаспадаркі зусім адсутнічалі. Можна толькі меркаваць, што на падставе гэтага крытэрыю адсотак кулакоў

у Скідзельскай воласці выглядаў бы вельмі мізэрным. Не ўдалося нам знайсці матэрыялаў па выкарыстанні наёмнай працоўнай сілы. Падобныя звесткі ўтрымліваюць, напрыклад, перапісныя лісты 1897 г. Але адносна вёсак Скідзельскай воласці такія крыніцы не захаваліся.

Аднак усе крытэрыі, якія грунтуюцца на пэўных колькасных параметрах сялянскай дваровай гаспадаркі, маюць адну вельмі істотную заганy, зусім не ўлічваюць наступстваў ключавога, на нашу думку, працэсу ў парэформеннай беларускай вёсцы — няспыннага іх падзелу. У выніку заможная на сённяшні дзень сялянская гаспадарка назаўтра магла ператварыцца ў дзве-тры сярэднія, а то і бедныя. Напрыклад, паводле даных праўлення Скідзельскай воласці, на пачатак 1915 г. з 822 надзельных участкаў, утвораных пасля рэформы 1861 г., на дзве часткі падзяліліся 302 (36,7 %), на тры — 234 (28,5 %), на чатыры — 97 (11,8 %), на пяць — 31 (3,77 %), на шэсць — 8 (0,97 %), на сем — 4 (0,49 %), на восем — 11 (1,34 %). Непадзеленымі засталіся толькі 135 участкаў (16,4 %) [25]. А сярод апошніх было яшчэ вельмі шмат батрацкіх і агародных, дзяліць якіх не было сэнсу. Сялянскае ж насельніцтва воласці за гэты час вырасла больш чым у два разы. Такім чынам, менавіта імклівы дэмаграфічны рост, які звычайна выклікаў падзелы бацькоўскіх гаспадарак паміж жанатымі сынамі, трэба прызнаць галоўнай прычынай нарастання сялянскага малазямелля, а не хцівасць кулакоў.

Самым істотным, з нашага пункту гледжання, крытэрыем прыналежнасці да заможнага сялянства варта лічыць набыццё зямлі ў прыватную ўласнасць. Нават датэрміновы выкуп свайго надзелу азначаў, што гаспадар здолеў сабраць немалыя на той час грашовыя накапленні. Таму падобных выпадкаў і было адносна няшмат. Напрыклад, В. Насевіч налічыў у мікрарэгіёне Кораньшчына сем такіх гаспадароў, выкупіўшых свае надзелы [26, с. 254]. Праўда, цяжка сказаць, наколькі апраўданай і рацыянальнай з’яўлялася падобная інвестыцыя. Звычайна, як сведчаць прагледжаныя намі дакументы, сяляне ішлі на гэты крок, каб замацаваць надзел у сваёй асабістай уласнасці і абараніцца ад маёмасных прэтэнзій сваякоў.

Якраз на падставе аналізу матэрыялаў пра набыццё зямлі нам удалося прасачыць гісторыі некалькіх заможных гаспадароў Скідзельшчыны. Рэформа 1861 г. адкрывала для такіх сялян недасягальныя ў часе прыгону магчымасці сацыяльнага і матэрыяльнага жыццёвага поспеху. Цяпер «багатыры» маглі без абмежаванняў набываць у поўную ўласнасць зямлю, якая з’яўлялася адной з галоўных каштоўнасцей у сістэме жыццёвых каардынат беларускага селяніна. Паводле статыстыкі землеўладан-

ня Гродзенскага павета за 1885 г., у Скідзельскай воласці налічвалася болей 26 000 дзесяцін зямлі, з якой 13 801 дзесяціна (53 %) належала прыватным асобам, пераважна памешчыкам, а 11 950 дзесяцін (46 %) — сялянам [20, арк. 14]. Сярод прыватных уладальнікаў бачым трох сялян — Рыгора Мазалеўскага, Аляксандра Гайко і Міхала Аленскага. Апошні быў з незацверджанай дробнай шляхты і арандаваў зямлю ў мясцовых памешчыкаў яшчэ ў часы прыгону. Рыгору Мазалеўскаму належалі маёнткі Вялікая Мількаўшчына (895 дзесяцін) і Каўшова (1671 дзесяціна), а Аляксандру Гайко — засценак Грэбелька (236 дзесяцін).

Асаблівую цікавасць выклікае постаць Рыгора Мазалеўскага. Ён з'яўляецца прыкладам незвычайнага матэрыяльнага поспеху беларускага селяніна. У 1861 г. Мазалеўскі стаў першым старшынёй Скідзельскай воласці, а да гэтага быў паліцэйскім тысяцкім. У 1829 г. ягоны бацька Іван стаў адным з лідараў выступлення жыхароў Скідзеля супраць княгіні Калеты Чацвярцінскай. У выніку княгіня аддала Івана Мазалеўскага ў салдаты, а яго сын Рыгор выхоўваўся ў сям'і свайго роднага дзядзькі. У 1856 г. ён перайшоў на ўласную гаспадарку.

У 1864 г. уладальнік суседняга са Скідзелем маёнтка Каўшова Мікалай Кахоўскі падараваў Рыгору Мазалеўскаму 8 дзесяцін зямлі. У наступным 1865 г. ён купіў луг Абалонь у свайго былога пана Канстанціна Чацвярцінскага. Здзелка суправаджалася вострым канфліктам з сялянамі вёскі Гліняны, якія таксама прэтэндавалі на гэтую зямлю. Аказалася, што азначаны луг з пачатку XIX ст. знаходзіўся ў карыстанні заможных глінянскіх сем'яў Свёклаў і Гайко. У неўрадлівыя гады князь Чацвярцінскі аддаў палову гэтага лугу ў карыстанне яшчэ 15 глінянскіх гаспадароў, а гэта прывяло да спрэчак паміж сялянамі. Свёклы і Гайко былі сваякамі Мазалеўскага і разлічвалі на яго падтрымку ў барацьбе за Абалонь. Але князь зрабіў хітры ход і проста прадаў луг апошняму. Мазалеўскі жорстка падавіў супраціўленне глінянцаў, абклаўшы іх штрафамі за спробу забраць сена са спрэчнага лугу, а некаторых нават ўласнаручна збіў, ледзьве не пакалечыўшы [16].

У 1869 г. Рыгор Мазалеўскі пакінуў пасаду валаснога старшыні і засяродзіўся на сваёй гаспадарцы, якая ўвесь час разрасталася. А гэта прыводзіла да новых канфліктаў. У снежні 1877 г. селянін вёскі Каўшова Міхал Шагун падаў у Губернскую па сялянскіх справах прысутнасць прашэнне, у якім сцвярджаў, што былы яго пан Аляксандр Кахоўскі, паводле партыкулярнай здзелкі ад 13 кастрычніка 1868 г., уласнаручна ім падпісанай, «отдал ему в обеспечение взятые у него 150 руб., половину пустоши с лугами без огорода... более 6 десятин земли и обязался

при продаже имения совершить формальную купчую крепость, но лет пять тому скоропостижно помер, а имение Ковшово продано было судебным приставом Гродненской соединенной палаты Григорию Мозолевскому» [14]. Новы ўладальнік маёнтка не жадаў прызнаваць правы Шагуна на зямлю, якія не былі належна падмацаваны адпаведнымі дакументамі. Губернскія ўлады параілі Шагуну звярнуцца ў суд. Чым завяршылася справа, нам даведацца не ўдалося, але шанцаў выйграць судовы працэс у багацея Мазалеўскага, які ўжо карыстаўся паслугамі прафесійных адвакатаў, непісьменны Міхал Шагун, напэўна, не меў. У 1879 г. сяляне вёскі Пузавічы таксама судзіліся з Рыгорам Мазалеўскім за ўрочышча Старыну. Апошні ўжо не траціў асабісты час на судовыя пасяджэнні, яго даверанай асобай выступаў калежскі асэсар Алімп Бучынскі.

Можна меркаваць, што матэрыяльны поспех Мазалеўскага быў дасягнуты дзякуючы асабістым высілкам і здольнасцям. Яго сваякі не вылучаліся багаццем сярод жыхароў воласці. Брат Іван, які быў аддадзены ў дзяцінстве ў вайсковыя кантаністы, у 1871 г. патрабаваў ад другога брата Лявона дапусціць яго сумесна карыстацца спадчынным надзелам. Прычым ён сцвярджаў, што калі Рыгор Мазалеўскі перайшоў на новую гаспадарку, дык завяшчаў яму сваю долю. І Скідзельскі валасны суд прыняў пастанову на карысць Івана. Але міравы з'езд у сакавіку 1871 г. адмяніў гэтае рашэнне. Паводле закона, на зямлю маглі прэтэндаваць толькі тыя, хто быў запісаны ў дакументах паверачных камісій [11]. Такім чынам, родны брат аднаго з багацейшых сялян Беларусі апынуўся ў катэгорыі беззямельных. Калі ўжываць лексіку марксістаў, дык можна сказаць, што з адной сям'і выйшлі кулак і пралетарый.

Заможныя землеўладальнікі сялянскага паходжання станавіліся для былых аднавяскоўцаў чужакамі, новымі панамі. Цяпер на іх ужо пашыраліся характэрныя для прыгоннай вёскі нормы падвойнай маралі, калі тое, што з'яўлялася грахом адносна сваіх, зусім не лічылася такім у дачыненні да паноў. Напрыклад, у жніўні 1876 г. валасны суд спагнаў з жыхара Скідзеля Паўла Покаша за незаконную высечку жэрдак ў панскім лесе 4,5 руб. на карысць арандатара маёнтка Каўшова Восіпа Стальбоўскага, таксама селяніна [13]. У гэтай справе цікавасць для нас уяўляе той факт, што сем гаспадароў вёскі Сухаўляны падпісалі ліст (за непісьменных аднавяскоўцаў распісаўся адзін Сцяпан Дарошак), завераны пячаткай вясковага старасты, што яны далі Вікенцію Покашу «жердей по три, а некоторые по 4 штуки, и дали ему прутов для покрытия хлебного сарая, и поэтому он, Покош, в чужом материале не нуждался,

получивши от нас, сколько ему было нужно». Такім спосабам сяляне спрабавалі дапамагчы Покашу ў судовай спрэчцы са Стальбоўскім, хаця са зместу справы яўна вынікае, што тыя жэрдкі ён, несумненна, украў. Але крадзеж з панскага лесу ніколі не лічыўся сярод сялян амаральным учынкам, наадварот, яны заўсёды праяўлялі салідарнасць з тым, каго суд у гэтым абвінавачваў.

Трэба адзначыць, што набыццё сялянамі зямлі ва ўласнасць ускладнялася шэрагам фармальных перашкод, выкліканых палітычнай сітуацыяй на беларускіх землях пасля паўстання 1863 г. Пакупнікі павінны былі запаўняць анкеты, дзе ўказвалася іх сацыяльнае паходжанне, і «если покупщик крестьянин, то не принадлежит ли к бывшей польской шляхте». Акрамя таго, правяралася палітычная добранадзейнасць селяніна, ці не паходзіць ён «из упорствующих в исполнении обрядов православной веры». А калі пакупнік яшчэ быў каталіком паводле веравызнання, дык важную ролю адыгрывала мова, якую апошні выкарыстоўваў у хатнім побыце. У дадзеным выпадку перавагу давала якраз беларуская мова. Апроч таго, улады правяралі, ці ў стане пакупнік уласнымі сіламі абрабляць набытую зямлю. Гэта павінна было перашкодзіць набыццю зямлі памешчыкамі каталіцкага веравызнання праз падстаўных асоб з ліку сялян. Але, з другога боку, апошняе абмежаванне як бы апрыёры прадугледжвала, што селянін не будзе купляць зямлю для апрацоўкі яе парабкамі ці здачы ў арэнду. Зрэшты, падобнае сапраўды з'яўлялася вялікай рэдкасцю [9].

Прыкладам выкарыстання такіх фармальных працэдур можа паслужыць набыццё селянінам мястэчка Скідзель Якубам Іоскевічам 10 дзесяцін зямлі ва ўладальніцы маёнтка Котра Марыі Багатка. На запыт начальніка губерні міравы пасрэднік запатрабаваў у валасным праўленні «удостоверение в благонадежности в политическом отношении крестьянина Иоскевича» [12, арк. 1—1 адв.]. Паліцэйскі прыстаў таксама падаў у маі 1871 г. пісьмовую характарыстыку Іоскевіча, у якой гаварылася, што апошні «в бывших в здешнем крае беспорядках не участвовал, под полицейским надзором не состоит, дел о его подсудности у меня в производстве нет, а повода считать себя в политическом отношении неблагонадежным не подавал». Цікава, што гэты самы Якуб Іоскевіч ажаніўся яшчэ ў часы прыгону на шляхцянцы Марыі Пачабут і купіў у 1854 г. за 400 руб. у шляхцянак Эміліі і Карнеліі Яшчукевічавых у мястэчку Скідзель дом «с четырьмя комнатами, кухнею, конюшнею, сараем и погребом, а также с фруктовыми деревьями и с двумя чиншевыми плацами, вдоль к реке простирающимися» [18, арк. 4]. Такім чынам, гэты

выпадак з’яўляецца цікавым прыкладам таго, што прыгонны селянін мог ажаніцца на шляхцянцы і набыць ва ўласнасць за даволі вялікія на той час грошы нерухомую маёмасць.

Другім пасля Рыгора Мазалеўскага паводле заможнасці землеўладальнікам-селянінам быў у Скідзельскай воласці Аляксандр Гайко, якому ў 1881 г. належала 236 дзесяцін у засценку Грэбелька. У 1888 г. яго сыны Пётр і Аляксей падалі іск у скідзельскі валасны суд, каб адабраць участак зямлі плошчай каля 5 дзесяцін у вёсцы Гліняны ад удавы свайго роднага дзядзькі Рыгора Алены. Але валасны суд у дадзеным выпадку абараніў правы ўдавы, падкрэсліўшы, што Гайко і так маюць ва ўласнасці фальварак Грэбельку [17]. У 1900 г. 18 сялян з розных вёсак Скідзельскай і Азёрскай валасцей паскардзіліся гродзенскаму губернатару, што яны дамовіліся са скідзельскім яўрэем Ліпай Дражніным аб арэндзе ў апошняга ўчастка зямлі. Сяляне расчысцілі ад лесу 33 моргі зямлі, якія пачалі выкарыстоўваць пад ворыва, выплочваючы штогод Ліпе па 6 руб. за морг. Сам жа Ліпа арандаваў гэту зямлю ў памешчыка Аўгусціна Чачота. Але праз пэўны час, як пісалі сяляне, «еврей Липа Дразнин стал уже требовать от на горяздо больше возвышенной цены и с г. Чечоттом сделали контракт уже на имя крестьянина Алексея Алексеева Гайко, а сей последний воспретил нам посев и передал другим лицам готовую выработанную нами пашню за двойную цену» [15, арк. 234 адв.]. Пакрыўджаныя сяляне прасілі правесці дазнанне, бо ачыстка лесу каштавала 40 руб. за морг, «а еврея Липу Дразнина, как обманщика и жадного нашей обиды и его соучастника Алексея Алексеева Гайку в фиктивном их действии контракта подвергнуть законной ответственности» [15, арк. 235]. У тым жа дакуменце ўзгадвалася, што Пётр, Аляксей і Закхей Гайко дадаткова купілі ў памешчыка Чачота 10 дзесяцін зямлі ва ўрочышы Залясяны [15, арк. 301]. Малодшы з гэтых братоў Закхей на мяжы XIX—XX стст. служыў паліцэйскім акалодачным (начальнікам участка — акалодка) у павятовым Брэсце, у службовым фармуляры было адзначана, што яму належаць 78 дзесяцін зямлі ў Гродзенскім павеце [10, арк. 562]. Прадстаўнікі сям’і Гайко ў часы паншчыны выконвалі абавязкі касіраў і пісараў пры дворным кіраванні князёў Чацвярцінскіх. Напэўна, назапашаныя імі веды, сувязі і грашовы капітал дазволілі выкарыстаць тыя магчымасці абагачэння, якія прынесла рэформа 1861 г.

Такім чынам, самыя прадпрымальныя і заможныя сяляне пасля рэформы 1861 г. інвеставалі капіталы ў набыццё зямлі. Часта пры гэтым яны перасяляліся ў набытыя фальваркі і трацілі сувязі з той вясковай грамадой, з якой выйшлі. Але новыя багацеі маглі мець сур’ёзныя цяж-

касці з адаптацыяй да новых умоў, з адшуканнем новай сацыяльнай ідэнтычнасці, з усталяваннем адпаведнага іх матэрыяльнаму ўзроўню стылю і ладу жыцця. Напэўна, ужываючы сучасную мову, ім прыходзілася пераадольваць моцныя псіхалагічныя комплексы. Прыкладам гэтаму можа паслужыць здарэнне, якое адбылося 10 студзеня 1889 г. з сынам ужо знаёмага нам Рыгора Мазалеўскага Іванам. Пасля смерці бацькі ён стаў уладальнікам маёнтка Каўшова. У той дзень парабак князя Друцкага-Любецкага з фальварка Лаўна прускі падданы Андрэй Фалярынскі адвёз у Скідзель бульбу на параконнай фурманцы і вяртаўся назад у Лаўна. На дарозе ён дагнаў фурманку Івана Мазалеўскага і паспрабаваў таго апярэдзіць. Апошні расцаніў гэта як абразу і прыніжэнне свайго статусу, што мела трагічныя наступствы для няшчаснага Фалярынскага. Мазалеўскі, «подъехав к корчме при деревне Пузевичах, вызвал находившихся в оной несколько человек, которые начали наносить Фоляринскому побои, от которых он по доставлении приехавших в Пузевичи товарищами батраками домой в фольварок Лавно вскоре умер» [8, арк. 1]. Чым завяршылася разбіральніцтва па гэтай справе, нам невядома. Можна меркаваць, што, стаўшы багатымі землеўладальнікамі, сяляне Мазалеўскія не былі дапушчаны ў суседскую супольнасць мясцовых радавітых памешчыкаў, якая ўяўляла сабой напаўзамкнёную касту (сюды не дапускалася нават расійская арыстакратыя). Яны былі чужымі і для сваіх былых аднавяскоўцаў, і для паместнай шляхты.

З гадамі колькасць пакупнікоў зямлі сярод сялян увесь час узрастала. Паводле даных губернскай адміністрацыі, у 1884 г. гродзенскі губернатар выдаў 432 дазволы 701 селяніну на набыццё 6895 дзесяцін зямлі (у сярэднім 9,84 дзесяціны на гаспадара) [7]. У большасці выпадкаў прадаўцамі выступалі памешчыкі, сяляне складалі меней 10 % (усяго 41 дазвол). Тры дазволы былі выдадзены губернатарам сялянам Скідзельскай воласці: Аляксандр Целеш купіў тры дзесяціны ў Рыгора Мазалеўскага, Міхал Салей дзве дзесяціны ў князя Станіслава Чацвярцінскага, а Рыгор і Ігнат Бобкі амаль 40 дзесяцін у мешчаніна Ёселя Касоўскага. Адам Тулінскі з Горніцкай воласці набыў 11 дзесяцін у нашага знаёмага Рыгора Мазалеўскага ў вёсцы Пузавічы.

Толькі за студзень 1893 г. гродзенскі губернатар выдаў 59 дазволаў 147 сялянам на набыццё 527 дзесяцін (у сярэднім 3,6 дзесяціны на гаспадара) [9]. Самы вялікі надзел набыў Васіль Валасюк з Кобрынскага павета, які купіў 30 дзесяцін у памешчыка Мазеўскага. Сем гаспадароў з вёсак Некрашы і Кашубінцы Скідзельскай воласці купілі 17 дзесяцін ва ўрочышчы Пыраны князя Чацвярцінскага, дванаццаць гаспадароў з

былых дзяржаўных сялян гэтай воласці пры дапамозе Сялянскага банка купілі амаль 70 дзесяцін у князя Друцкага-Любецкага, а браты Бегуны з вёскі Залясяны — дзве дзесяціны ў фальварку Залясяны Чачотаў [9, арк. 995 адв., 996, 999]. Нельга адназначна сцвярджаць, што ўсе гэтыя пакупнікі належалі да катэгорыі заможных сялян. Часам гэта магла быць адчайная спроба ўратавацца ад малазямелля. Напрыклад, у 1894 г. селянін вёскі Каўшова Павел Дучак скардзіўся губернатару, што яго брат Мікалай вырашыў купіць у Рыгора Мазалеўскага дзве дзесяціны ворыва. Павел пасля вяртання з вайсковай службы сплаўляў плыты і баркі па Нёмане ў Коўна і Прусію і за 12 гадоў перадаў брату 124 рублі «на ведение и улучшение хозяйства». Ён прасіў начальніка губерні забараніць Мікалаю «самолично приобрести эту землю, так как он, ввиду изложенных обстоятельств, не может исключить меня от этой покупки на свое имя, чем лишить меня средств добытых кровавым трудом... окончательно обидеть меня с женой и малыми ребенками» [9, арк. 869—870]. Напэўна, у валасных статыстыках Павел Дучак праходзіў як беззямельны.

Даныя пра структуру зямельнай уласнасці ў Скідзельскай воласці падалі земскаму начальніку валасныя ўлады на пачатку 1905 г. Паводле гэтых даных, на Скідзельшчыне налічвалася 8 буйных землеўладальнікаў, якія мелі болей чым па 300 дзесяцін зямлі. Івану Рыгоравічу Мазалеўскаму належалі маёнткі Каўшова, Лагер і Кахоўка — 1135 дзесяцін, а яго брату Андрэю Рыгоравічу — Мількаўшчына і Грэбелька (1096,5 дзесяціны) [24, арк. 92—93]. Па плошчы ўладанні сям'і Мазалеўскіх саступалі ў воласці толькі ўладанням князя Станіслава Чацвярцінскага. Апрача Мазалеўскіх, яшчэ чацвёра сялян у воласці валодалі надзеламі плошчай ад 60 да 150 дзесяцін (у суме — 322 дзесяціны) [24, арк. 117]. Усяго ж у Скідзельскай воласці на той час налічваліся 1782 сялянскія валоданні (надзельныя і набытыя землі разам) плошчай 12 820 дзесяцін, ці ў сярэднім 7,2 дзесяціны на сялянскую гаспадарку [24, арк. 96]. Такім чынам, уладанні, большыя за 60 дзесяцін, складалі 0,34 % ад агульнай колькасці гаспадарак, але ім належала 16,6 % плошчы сялянскага землеўладання.

Нашчадкі Рыгора Мазалеўскага і надалей павялічвалі свае валоданні. У 1909 г. Сымон Рыгоравіч валодаў маёнткам Пілатаўшчына ў Гарадокскай воласці Беластоцкага павета, Леў Рыгоравіч — Радзівонічамі і Круглянамі ў Луненскай і Горніцкай валасцях Гродзенскага павета, Андрэй Рыгоравіч — Грэбелькай у Скідзельскай воласці, Іван Рыгоравіч — Каўшовам [22, арк. 328, 339]. Усяго ж у Гродзенскай губерні сялянам нале-

жала 69 маёнткаў, больш за 150 дзесяцін, што складала 9,6 % ад агульнай колькасці такіх маёнткаў. Такім чынам, кожны пяты вялікі маёнтак у губерні ўжо меў уладальніка сялянскага паходжання. Паводле іншых даных за гэты перыяд, сярод уласнікаў зямлі памерам ад 15 да 150 дзесяцін налічвалася 958 дваран і 2496 уласнікаў нешляхецкага паходжання. Апошнія пераважна былі сялянамі. Сярод уладальнікаў маёнткаў, большых за 150 дзесяцін, дваран налічвалася 921, а недваран — 185 [19, арк. 5—6]. Да самога пачатку Першай сусветнай вайны купленыя землі займалі адносна невялікую долю ў сялянскім землеўладанні на Скідзельшчыне. Паводле даных валаснога праўлення на пачатак 1915 г. у Скідзельскай воласці сярод засеяных сялянамі палеткаў набытыя землі складалі каля 17 % іх плошчы [25, арк. 44].

Мікрагістарычнае даследаванне Скідзельскай воласці дазваляе сцвярджаць, што ў парэформенны перыяд такіх багацеяў з ліку сялян, каго сапраўды можна было б смела назваць кулаком ці буржуа, хто займаўся спекулятыўнымі купляй і продажам зямлі, абрабляў яе пры дапамозе парабкаў і атрымліваў вялікія прыбыткі, налічвалася ўсяго некалькі сем'яў. Прычым гэтыя «багатыры» набывалі зямлю ў памешчыкаў, а не скуплялі надзелы бедных аднавяскоўцаў. Усе яны ці іх бацькі займалі даволі высокія пазіцыі ў мясцовым грамадстве яшчэ ў часы прыгону, а пасля рэформы 1861 г. здолелі скарыстаць новыя магчымасці і рэалізаваць назапашаны капітал. Для астатняй жа часткі заможнага сялянства, тых, хто здолеў павялічыць ці хаця б захаваць свае спадчынныя зямельныя надзелы, іх маёмасны статус заставаўся даволі няпэўным і моцна залежаў ад дэмаграфічнага фактару, які нёс у сабе неадступную пагрозу малазямелля.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / пад рэд. В. П. Панюціча. Мінск, 1997—2002. Т. 2 : Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. 2002.
2. *Дудкоў Д. А.* Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX і пачатку XX ст. Мінск, 1932.
3. *Кернажыцкі К. І.* Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мінск, 1932.
4. *Кожушков А. И.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. Минск, 1963.
5. *Липинский Л. П.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.). Минск, 1971.
6. *Маскевич Г. І.* Сацыяльная стратыфікацыя сялянства Беларусі ў 60—90-я гг. XIX ст. : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск : БДУ. 2011.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей — НГАБ у г. Гродна). Ф. 1. Воп. 17. Спр. 404. Ведамасці пра колькасць прададзенай сялянам у Гродзенскай губерні зямлі. 1884 г.
8. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 17. Спр. 1716. Ведамасці пра розныя здарэнні ў Гродзенскім павеце за 1889—1890 гг.
9. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 18. Спр. 241. Прашэнні розных асоб аб выдачы дазволаў на набыццё зямлі. 1893—1894 гг.
10. НГАБ у г. Гродна. Ф. 2. Воп. 37. Спр. 2360. Фармулярныя спіскі чыноўнікаў Гродзенскага губернскага праўлення.
11. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 267. Справа па скарзе селяніна м. Скідзель І.Мазалеўскага на пазбаўленне яго права карыстацца надзелам зямлі. 1871 г.
12. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 333. Аб дазволе купіць зямлю селяніну м. Скідзель Я. Іоскевічу. 1871 г.
13. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 1831. Аб спагнанні з Паўла Покаша 4 руб. на карысць арандатара маёнтка Каўшова Стальбоўскага. 1876 г.
14. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 1992. Прашэнне селяніна Міхала Шагуна аб выдачы яму пасведчання пра набыццё зямлі ў памешчыка М. Кахоўскага. 1877—1878 гг.
15. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 3. Спр. 163. Выкупны акт маёнтка Галавачы Ціта Чачота.
16. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 3. Спр. 476. Спрэчка за зямлю паміж сялянамі вёскі Гліняны. 1866 г.
17. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 9. Спр. 93. Спрэчка Пятра і Аляксея Гайкаў з Аленай Гайко за зямлю. 1888 г.
18. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 17. Спр. 598. Размежаванне земляў маёнтка Скідзель. 1864—1886 г.
19. НГАБ у г. Гродна. Ф. 10. Воп. 20. Спр. 392. Размеркаванне зямельнай уласнасці ў Гродзенскім павеце.
20. НГАБ у г. Гродна. Ф. 11. Воп. 3. Спр. 140. Статыстыка пазямельных валоданняў Гродзенскага павета за 1885 г.
21. НГАБ у г. Гродна. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 248. Ведамасці пра колькасць надзеленай сялянам зямлі ў Гродзенскім павеце. 1895 г.
22. НГАБ у г. Гродна. Ф. 17. Воп. 1. Спр. 342.
23. НГАБ у г. Гродна. Ф. 18. Воп. 1. Спр. 1034. Аб аказанні дапамогі сялянам, якія перайшлі на аднаселі. 1908—1911 гг.
24. НГАБ у г. Гродна. Ф. 534. Воп. 1. Спр. 3. Статыстыка 5-га земскага ўчастка. 1905 г.
25. НГАБ у г. Гродна. Ф. 534. Воп. 1. Спр. 28. Раздрабленне сялянскіх надзелаў на пачатак 1915 г.
26. *Носевич В.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск, 2004.
27. *Панютич В. П.* Наёмный труд в сельском хозяйстве Белоруссии. 1861—1914 гг. Минск, 1996.
28. *Панютич В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни. 1861—1900 гг. Минск, 1990.
29. *Шабуня К. И.* Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Минск, 1962.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 15 студзеня 2012 г.